# Весці

## БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**№ 3 (21) 1999**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

*Галоўны рэдактар:*
Л. Н. Ціханаў

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
А. А. Грымаць
І. І. Казімірская
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
І. А. Новік
М. М. Плескацэвіч (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. В. Фіялкоўская (*адказны сакратар*)
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

### ЗМЕСТ

***З Танкаўскіх чытанняў***

*Ціханаў Л. Н.* Уступнае слова .................... 3

*Шаўлоўская М. Ф.* Творчасць Максіма Танка: шматграннасць таленту .................... 5

***Педагогіка***

*Вадзінскі Д. І.* Андрагогіка як тэорыя навучання дарослых .................... 10

*Анатольева Н. С.* Развіццё праблемы інтэрнацыянальна-патрыятычнага выхавання ў спадчыне класікаў педагогікі .................... 17

*Дзядзюля Н. М.* Мадэль арганізацыі самастойнай працы студэнтаў .................... 23

*Ерашэўская А. Л.* Тэставы кантроль як сродак кіравання падрыхтоўкай студэнтаў па вышэйшай матэматыцы .................... 29

*Рачков С. А.* Политическая культура студента: теоретический аспект .................... 34

***Мовазнаўства***

*Петыш Т. В.* Суадносіны прэдыкатыўнасці і прапазітыўнасці ў складаназалежных сказах з дадымі часу .................... 41

*Трофимович Т. Г.* Неоднословные названия лиц в системе номинативных средств старорусского делового языка .................... 46

*Чернышева Л. В.* Концептуализация меда в наивной картине мира русских и белорусов .................... 52

*Кабелка Н. И.* Структура слога древнерусских существительных на -ица/-ница .................... 61

*Мормыш Л. С.* Устаревшая лексика в художественных произведениях М. Горецкого и их переводах на русский язык .................... 70

***Літаратуразнаўства***

*Бушыла Н. В.* Прымач у «панстве» і пасынак вёскі: праблема духоўнага станаўлення асобы ў творах М. Гарэцкага .................... 76

АРК

6. *Арэхва М.* Рэвалюцыйны рух у Заходняй Белару ў гады белапольскай акупацыі. Мн., 1958. С. 21.
7. Революционный путь Компартии Западной Белорус (1921—1939 гг.). Мн., 1966. С. 194.
8. Голас працы. 1928. № 9. С. 4.
9. *Бергман А.* Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Мн., 19
10. *Полуян В. А.* Революционно-демократическое движе в Западной Белоруссии (1927—1939 гг.). Мн., 1978. С. 72.
11. НАРБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 252. Л. 30.
12. НАРБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 215.
13. НАРБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 217 аб. Л. 1—4.
14. *Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д.* І. С. Дварчанін: Гіс рыка-біяграфічны нарыс. Гродна, 1995. С. 43—44.
15. *Полуян В. А.* и *Полуян И. В.* Революционное и на нально-освободительное движение в Западной Белорус в 1920—1939 гг. Мн., 1962. С. 136.
16. *Якаўлеў Л.* Заходняя Беларусь. Мн., 1931. С. 21.
17. НАРБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 110. Л. 166, 205.
18. НАРБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 367. Л. 3.
19. НАРБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 256ᵃ. Л. 53—54.
20. *Боген Д.* Заходняя Беларусь пад крывавым бізун польскіх акупантаў. Мн., 1931. С. 11.
21. Краіна шыбеніц і карных экспедыцый. Мн., 1932. С. 12

*SUMMARY*

*This article is devoted to the activity of the West Byelorussion le revolutionary-democratic and the national-emancipatory organizat «Zmaganne» which activity was the release of the political prisoners. T author does a conelusion, what this struggle composes a considerable pa of the activity of the organization.*

УДК 947.085(476)

*А. А. Каваленя*

## БЕЛАРУСКАЯ МОЛАДЗЬ У ЧАС ВЫЗВАЛЕННЯ РЭСПУБЛІКІ АД ГЕРМАНСКІХ АГРЭСАРАЎ

Падзеі на савецка-германскім фронце летам 1943 г. был надзвычай напружанымі і разгортваліся на карысць СССР. Няўдачы вермахта пад Сталінградам зімой 1942—1943 гг. па дарвалі ваенную магутнасць, маральны стан вайскоўцаў і на сельніцтва Германіі, яе прэстыж у краінах-сатэлітах. Каб стабі лізаваць унутрыпалітычнае становішча, прадухіліць распад

агрэсіўнага альянсу, авалодаць ваенна-стратэгічнай ініцыятывай, павярнуць падзеі на ўсходнім фронце на карысць Трэцяга Рэйха і нанесці знішчальны ўдар войскам Чырвонай Арміі, ваенна-палітычныя колы прынялі рашэнне ажыццявіць буйную наступальную аперацыю.

Камандаванне вермахта распрацавала план наступлення ў раёне Курскага выступа. Аперацыя атрымала назву «Цытадэль». Сіламі армій «Цэнтр» (камандуючы генерал-фельдмаршал Г. Клюге) і «Поўдзень» (камандуючы генерал-фельдмаршал Э. Манштэйн) праціўнік выразшыў ударамі з поўначы і поўдня акружыць і знішчыць войскі Цэнтральнага фронту (камандуючы генерал арміі М. Ф. Ватуцін), затым нанесці ўдар у тыл Паўднёва-Заходняга фронту (камандуючы генерал арміі Р. Я. Маліноўскі) і развіць наступленне на Паўночна-Заходнім напрамку. Для ажыццяўлення аперацыі былі задзейнічаны найбольш баяздольныя, добра падрыхтаваныя і палітычна надзейныя фарміраванні вермахта, а таксама вопытныя германскія генералы. Ваенная групоўка налічвала звыш 900 тыс. чалавек [1, с. 393].

Савецкая разведка выкрыла намеры ворага. Камандаванне Чырвонай Арміі, улічваючы трагічныя ўрокі 1941—1942 гг., зрабіла ўсё магчымае, каб выставіць надзейны заслон. Войскі Варонежскага, Цэнтральнага і Сцяпнога франтоў стварылі моцны абаронны рубеж, які складаўся з 8 палос на глыбіню да 300 км. Адначасова вялася падрыхтоўка войск Заходняга і Бранскага франтоў (камандуючыя генералы-палкоўнікі В. Д. Сакалоўскі і М. М. Папоў) да рашаючага контрнаступлення на Арлоўскім і Белгародска-Харкаўскім напрамках. Агульнае кіраўніцтва і каардынацыю дзеянняў ажыццяўлялі прадстаўнікі Стаўкі ВГК маршалы Савецкага Саюза Г. К. Жукаў і А. М. Васілеўскі.

Маючы дакладны час пачатку аперацыі «Цытадэль», савецкае камандаванне загадала нанесці раніцай 5 ліпеня 1943 г. папераджальны ўдар па раёнах канцэнтрацыі нямецкіх войск. Праціўнік панёс велізарныя страты і ў выніку згубіў ініцыятыву. Ужо ў першы дзень аперацыі германскія вярхі вымушаны былі ўвесці ў дзеянне асноўныя сілы. Да 12 ліпеня наступленне ... ў паласе Цэнтральнага фронту спынілася кан... валіліся намеры ... ...тупа, дзе толькі ў раёне Прохараўкі немцы стр... салдат і афіцэраў забітымі

...дат і афіцэраў забітымі

Паспяховае наступленне Чырвонай Арміі на Белгарод-
Харкаўскім напрамку завяршылі 50-дзённыя баі на Курс
дузе. Вораг страціў 30 адборных дывізій, 3 тыс. гар
15 танкаў, звыш 3,7 тыс. самалётаў. Савецкая Армія вый
да Дняпра. Войскі Цэнтральнага і Заходняга франтоў у кан
верасня 1943 г. уступілі на тэрыторыю Беларусі, палажы
пачатак вызваленню нашай Бацькаўшчыны.

У дадзеным артыкуле ставіцца мэта комплексна асвятл
ваенна-палітычную сітуацыю, якая склалася на Беларусі ў
вызвалення яе тэрыторыі ад германскіх агрэсараў. На падст
навейшых даследаванняў айчынных і замежных навукоў
увядзення ва ўжытак шэрага новых архіўных дакументаў і
тэрыялаў ажыццяўляецца спроба паказаць патрыяты
ўздым беларускіх юнакоў і дзяўчат, асэнсаваць маральна-псі
лагічныя праблемы, якія прыводзілі да ідэйна-палітычнага
межавання ў маладзёжным асяроддзі і нават узброен
супрацьстаяння.

Адзначым, што поспех войск Чырвонай Арміі пад Ар
і Курскам садзейнічаў умацаванню маральнага духу больш
часткі беларускага грамадства, уздыму супраціўлення герм
скім акупантам. Калі ў канцы 1941 г. на акупіраванай тэр
торыі змагалася 45 тыс. партызан, то ў 1943 г. — больш
127, а ў 1944 г. — 374 тыс. Пад кантролем партызан зн
ходзілася звыш 60% тэрыторыі Беларусі [2]. Патрыёты ажы
цяўлялі шырокамаштабныя аперацыі па разгрому апорн
пунктаў ворага, баявыя акцыі па дэзарганізацыі транспартн
камунікацый у яго тыле. Напрыклад, у разгар Курскай біт
яны падарвалі 761 эшалон і 2 бронепаязды праціўніка. Пав
ле даных транспартнага аддзела групы армій «Цэнтр», у ліпе
1943 г. рух па чыгунках быў закрыты поўнасцю на 4922 г
дзіны, а на працягу 2868 гадзін эшалоны рухаліся толькі
адной каляіне. У сярэднім партызаны штодзённа рабілі 36 ды
версій, з якіх 32 разлічваліся на затрымку руху паяздоў [3,
с. 285—286].

Камсамольска-маладжёжнае патрыятычнае падполле наб
рала сілу, павялічвалася колькасць яго членаў. На канец
1943 г. яно набыло закончаную арганізацыйную і добракіру
мую структуру. На акупіраванай тэрыторыі знаходзілася груп
кіруючых работнікаў ЦК ЛКСМБ, 10 падпольных абкамаў,
11 міжрайкамаў і цэнтраў, 14 гарадскіх і 189 раённых каміт
таў ЛКСМБ. На прамысловых прадпрыемствах, транспарце
у сельскай мясцовасці, у органах акупацыйных улад былі за
снаваны і актыўна дзейнічалі каля 3,5 тыс. падпольных камса
мольска-маладзёжных арганізацый, у якіх налічвалася больш

за 20 тыс. маладых патрыётаў. Каля 80 тыс. юнакоў і дзяўчат, аб'яднаных у 2,5 тыс. пярвічных камсамольскіх арганізацый, змагаліся ў радах беларускіх партызан [4].

Падпольныя камсамольскія органы і арганізацыі мелі вялікі ўплыў на падрастаючае пакаленне акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Адзначым, што з 374 тыс. беларускіх партызан каля 250 тыс. былі да 30-гадовага ўзросту [5], на долю якіх выпадалі складаныя і адказныя баявыя даручэнні.

Рост радоў партызан за кошт мясцовай моладзі стрымліваўся па прычыне недахопу зброі і боепрыпасаў. У паведамленнях камандавання партызанскіх фарміраванняў адзначалася, што колькасць партызан без асаблівых намаганняў магла быць павялічана ў 2—3 разы. Характарызуючы настрой моладзі, сакратар Гомельскага падпольнага абкама А. Д. Рудак у пісьме першаму сакратару ЦК ЛКСМБ М. Е. Зімяніну, адзначаў, што юнакі і дзяўчаты ў масавым парадку жадаюць уступіць у атрады. «Усіх прыняць мы не можам, — падкрэслівалася ў ім, — таму такіх людзей мы залічваем у рэзерв. Даём даручэнні на правядзенне разведкі важных для нас аб'ектаў» [6, с. 285].

Берлінскія палітычныя колы і камандаванне вермахта прызнавалі важнасць тэрыторыі Беларусі, што непасрэдна звязвала Трэці Рэйх з Усходнім фронтам. Генералы 3-й танкавай арміі, якая дыслацыравалася ў раёне Віцебска, у загадах і распараджэннях выказвалі занепакоенасць станам развіцця сітуацыі: «Раён Віцебска з'яўляецца цяпер самым небяспечным участкам Усходняга фронту», «Размова ідзе пра выратаванне Германіі», «Віцебск набыў для ўсіх асаблівае значэнне», «Віцебск — гэта наш лёс» [7].

Камандуючы 3-й танкавай арміяй генерал-палкоўнік Рэйнгард атрымаў 13 мая 1944 г. загад Гітлера, паводле якога Віцебск аб'яўляўся германскай крэпасцю. Раскрываючы матывы падзенага рашэння Гітлера, камандуючы групай арміі «Цэнтр» фельдмаршал Буш падкрэсліў, што тут «замешаны таксама прэстыж. Віцебск з'яўляецца адзіным горадам на ўсім Усходнім фронце, пры страце якога занепакоіцца ўвесь свет» [7].

Для ўтрымання беларускага плацдарма нямецкае камандаванне выкарыстала ў антыпартызанскай вайне ў канцы 1943 — першай палове 1944 г. каля 11 дывізій вермахта, а усяго супраць народнага ўздыму — 18 дывізій, а таксама войскі аператыўнага рэзерву, некаторыя часці, што накіроўваліся на фронт, і тыя, што адводзіліся ў тыл для перафарміравання і адпачынку. У аперацыях супраць партызан у студзені—чэрвені 1944 г. удзельнічала каля 370 тыс. германскіх салдат і афіцэраў [8, с. 102].

Беларусь была пакрыта густой сеткай паліцэйска-жан... скіх гарнізонаў, ваенных камендатур і апорных пунктаў ...га. Тут размяшчаліся шматлікія часці войск СС, паліцыі бя... кі і СД, фарміраванні тайнай палявой паліцыі, абвера, тыс... агентаў германскіх спецслужбаў, якія былі завербаваны з ... роддзя мясцовага насельніцтва і ваеннапалонных Чырво... Арміі і вялі работу на карысць нацысцкай Германіі [8, с. 17...].

Аднак сілавыя метады ўпраўлення захопленымі тэрыто...мі не прыносілі жаданых вынікаў. Палітычныя колы Трэ... Рэйха, асабліва прадстаўнікі мясцовых органаў акупацы... улады, схіляліся да думкі прыцягнуць мясцовыя палітычны... лы ў сферу ўпраўлення, пры гэтым стаўка рабілася на молад...

22 чэрвеня 1943 г. у Мінску адбылося афіцыйнае адкры... Саюза беларускай моладзі (СБМ). Шырока разгарнулася агі...цыйна-прапагандысцкая кампанія, што дазволіла ўжо ў ка... года стварыць маладзёжныя суполкі ў большасці паветаў Ге...ральнай акругі Беларусь. Напрыклад, у Баранавіцкай акр... ў радах СБМ налічвалася звыш 2200 чалавек, у Вілейскай — каля 700. Усяго ў 10 гебітсакругах Генеральнай акругі Бе...русь, а таксама ў прыфрантавой зоне і на беларускіх тэрыто...ях, што адышлі ў склад Рэйхскамісарыята Украіна і акругі Бе...ласток, у рады саюза было ўцягнута каля 12 тыс. чалавек [... с. 177]. Створаныя суполкі разгортвалі дзейнасць у асноўным ... мясцовасцях, якія знаходзіліся пад моцнай аховай германск... войск: у цэнтрах гебітскамісарыятаў, буйных гарадах, абаро...чых вёсках, населеных пунктах, дзе размяшчаліся ваенн... паліцэйскія гарнізоны.

Вясной 1944 г. на акупіраванай тэрыторыі Беларусі зас...ваны іншыя маладзёжныя саюзы. У студзені—сакавіку разг...нулася вялікая агітацыйная кампанія па стварэнні ў Бабру...ску новай структурнай адзінкі. Камандаванне 9-й нямецкай ...міі 4 сакавіка 1944 г. на масавым мітынгу на плошчы ў Ба...руйску абвясціла аб заснаванні Саюза барацьбы супраць бал...шавізму (СБСБ). Арганізацыя мела некаторы ўплыў на молад... Бабруйскай акругі і налічвала звыш тысячы чалавек. Агульн... кіраўніцтва дзейнасцю саюза ажыццяўляў былы капітан Чыр...вонай Арміі Міхаіл Октан [9, с. 180—183].

Барысаў стаў месцам заснавання Саюза рускай мола... (СРМ). Як і СБСБ, СРМ ствараўся пры падтрымцы германска... ваеннага камандавання. Асноўным кантынгентам маладзё...нага саюза былі маладыя вайскоўцы Рускай народнай ар... паліцэйскія і дзеці сямей, якія вымушаны былі эвакуіравац... на Беларусь з вызваленых Чырвонай Арміяй раёнаў Расіі і слу...жылі ў акупацыйных дапаможных уладах [9, с. 178].

Заснаванне Саюза татарскай моладзі (СТМ) было вынікам напружанай дзейнасці духоўнага лідэра татар-мусульман Якаба Шынкевіча. Яго настойлівыя перамовы, пачынаючы з лета 1942 г., з кіраўніцтвам Генеральнага камісарыята Беларусь, прынеслі поспех толькі ў маі 1944 г. Штаб рускага аддзялення СТМ, які ўзначальваў Хусейн Якубоўскі, знаходзіўся ў Баранавічах [9, с. 178].

Германскія ўлады ставілі перад маладзёжнымі саюзамі канкрэтныя задачы, дзе галоўнай з'яўлялася вярбоўка моладзі на працу ў германскі рэйх. Ужо з вясны 1944 г. адбываўся запіс беларускай моладзі ў ваенна-дапаможныя фарміраванні германскага вермахта.

Разгорнутая акцыя па стварэнні маладзёжных саюзаў сустрэла актыўнае супраціўленне з боку камуністычна настроенай часткі беларускай моладзі, асабліва членаў камсамольска-маладзёжнага падполля. Нягледзячы на тое, што падрыхтоўка заснавання маладзёжных прагерманскіх саюзаў вялася ў вялікай сакрэтнасці, агентура партызанскай разведкі выкрыла намеры акупантаў. Ужо ў пачатку ліпеня 1943 г. ЦК ЛКСМБ разаслаў падпольным абласным камітэтам ЛКСМБ ліст «Аб рабоце камсамола Беларусі па выкрыццю і разлажэнню гітлераўскай маладзёжнай арганізацыі «Саюз беларускай моладзі» [10].

Падпольныя абласныя і многія раённыя камітэты ЛКСМБ разгарнулі шырокую кампанію па зрыву дзейнасці прагерманскіх саюзаў. Былі выпушчаны спецыяльныя лістоўкі, вяліся радыёперадачы, падпольшчыкі-агітатары праводзілі работу сярод моладзі ў населеных пунктах, растлумачвалі мэты ворага. Напрыклад, Мінскі падпольны АК ЛКСМБ выдаў каляровы плакат-лістоўку, у якой па-свойму расшыфраваў абрэвіятуру «СБМ» — «Смерць беларускай моладзі» [11, с. 99].

Маладыя патрыёты засылалі ў рады прагерманскіх саюзаў сваіх агентаў, якія вялі мэтанакіраваную работу па зрыву палітыкі акупантаў, ажыцяўлялі нават дыверсіі і праводзілі тэрарыстычныя акцыі ў адносінах да кіраўнікоў саюзаў. Асабліва актыўна дзейнічалі падпольшчыкі Мінскай, Вілейскай, Баранавіцкай абласцей [12].

Падкрэслім, што ў час, калі разгортвалася работа па стварэнні маладзёжных саюзаў, са спецпадраздзяленняў германскія вайскоўцы ажыццявілі дзесяткі карных аперацый па «ўміратварэнні» беларускага насельніцтва, вынішчалі цэлыя раёны. Каб зламаць волю беларусаў да супраціўлення, садысты намерана іх застрашвалі, заганялі ў хлявы, царкоўныя храмы, аблівалі гаручай вадкасцю і падпальвалі. За час вайны на Беларусі знішчана 9200 населеных пунктаў, з іх 5295 былі спалены з усімі

ці часткай жыхароў. У Віцебскай вобласці 243 вёскі спальвалі двойчы, 83 — тройчы, 22 — чатыры і больш разоў [13].

Каб аслабіць біялагічны патэнцыял беларусаў, нацысты спланавалі аперацыю па дэпартацыі падрастаючага пакалення ў рэйх, што праводзілася пад кодавай назвай «Сена». У Мінску разгарнула сваю дзейнасць каманда «Цэнтр», удзельнікі якой займалася адпраўкай дзяцей і падлеткаў у Германію. У адным з дакументаў Міністэрства ўсходніх акупіраваных абласцей ад 14 чэрвеня 1944 г. адзначалася, што камандаванню групы армій «Цэнтр» даручана захапіць 40—50 тыс. падлеткаў. Ажыццяўляючы пастаўленую задачу, германскія вайскоўцы і спецыяльныя падраздзяленні праводзілі масавыя аблавы на дзяцей. Так, у Парыцкім раёне ў канцы чэрвеня была праведзена аперацыя, у выніку якой звыш 3 тыс. дзяцей і падлеткаў былі адпраўлены ў рэйх. У гэты ж час на чыгуначнай станцыі Блужа Пухавіцкага раёна воіны 65-й арміі 1-га Беларускага фронту захапілі 22 вагоны з дзецьмі, якіх акупанты імкнуліся вывезці ў Германію [14].

Беларускія юнакі і дзяўчаты актыўна ўліваліся ў рады партызан і падпольшчыкаў. Моладзь займала авангардную ролю ў ажыццяўленні баявых і дыверсійных акцый. Па ініцыятыве камсамольскіх арганізацый у партызанскіх падраздзяленнях разгарнуўся масавы рух па авалоданні баявым майстэрствам. Напрыклад, у Віцебскай вобласці з пачатку вызвалення Беларусі і да студзеня 1944 г., з ліку партызанскай моладзі было падрыхтавана 2635 кулямётчыкаў, 2721 падрыўнік, 778 знішчальнікаў танкаў, 2041 аўтаматчык, 632 мінамётчыкі, 283 снайперы, 312 санінструктараў [15]. У партызанскіх фарміраваннях Беларусі былі створаны 2477 камсамольска-маладзёжных дыверсійных груп, якія аб'ядноўвалі 22 тыс. маладых падрыўнікоў [16]. Актыўнасцю ў вобласцях вызначаліся групы «знішчальнікаў» і «паляўнічых», якія на сваім баявым рахунку мелі дзесяткі забітых варожых салдат і афіцэраў. У Баранавіцкай вобласці дзейнічала 150 груп знішчальнікаў, У Магілёўскай у чатырох партызанскіх брыгадах — 176 такіх падраздзяленняў [11, с. 141, 181].

У час вызвалення тэрыторыі Беларусі масавы патрыятычны рух юнакоў і дзяўчат набыў шырокія памеры. У большасці партызанскіх фарміраванняў існавала шмат камсамольска-маладзёжных аддзяленняў і рот, нават асобныя атрады і брыгады. Усяго налічвалася 28 узорных камсамольска-маладзёжных партызанскіх атрадаў і 7 брыгад па арганізацыі баявой і дыверсійнай дзейнасці [17].

Больш поўную характарыстыку паводзін беларускай

моладзі пры вызваленні рэспублікі ад германскіх агрэсараў можна даць на прыкладзе яе дзеянняў у Вілейскай вобласці. У справаздачы сакратара Вілейскага падпольнага абкома камсамола Пятра Машэрава за першыя месяцы 1944 г. значылася, што ў партызанскіх фарміраваннях вобласці функцыянавала 58 камсамольска-маладзёжных падраздзяленняў і груп. У студзені—лютым 1944 г. у баявых аперацыях удзельнічалі 1632 камсамольцы. За гэты час маладыя партызаны знішчылі 1169 акупантаў і 349 паранілі, падарвалі 60 цягнікоў, разграмілі 12 гарнізонаў ворага, вывелі са строю вялікую колькасць мастоў, ліній сувязі і баявой тэхнікі. Сакратар адзначаў, што маладыя партызаны і падпольшчыкі вобласці разгарнулі шырокую агітацыйна-прапагандысцкую работу. Агітатарамі працавалі 469 юнакоў і дзяўчат. У першыя два месяцы 1944 г. яны правялі звыш 3 тыс. гутарак і дакладаў, на якіх прысутнічала да 50 тыс. партызан і мясцовых жыхароў, распаўсюдзілі ў населеных пунктах і варожых гарнізонах больш за 13 тыс. лістовак, падпольных газет, ды шмат іншай ліаратуры. Сіламі маладзёжнага агітацыйнага атрада імя М. Горкага (мастацкі кіраўнік Аляксандр Нікалаеў) было арганізавана 97 канцэртаў і 25 вечароў адпачынку для 35 тыс. чалавек. У населеных пунктах вобласці дзейнічалі 214 камсамольска-маладзёжных арганізацый, што аб'ядноўвалі 990 юнакоў і дзяўчат. Члены падпольных арганізацый ажыццявілі ў лютым—студзені 1944 г. 17 дыверсій і тэрарыстычных актаў, у час якіх было забіта 26 акупантаў і паліцэйскіх, выведзены са строю шашэйныя масты, сабрана і перададзена партызанам вялікая колькасць каштоўных разведвальных даных, распаўсюджана каля 4 тыс. экзэмпляраў нелегальных выданняў [18].

Такім жа чынам разгорваліся падзеі на яшчэ акупіраваных тэрыторыях Мінскай, Баранавіцкай, Брэсцкай, Пінскай ды іншых абласцей. Камсамольцы карысталіся значным аўтарытэтам сярод партызан і мясцовага насельніцтва. Лепш падрыхтаваныя ў вайсковай справе, яны назначаліся на камандныя пасады. Напрыклад, у Мінскай вобласці з ліку камсамольцаў было прызначана 640 камандзіраў аддзяленняў, 118 камандзіраў узводаў, 114 палітрукоў і камандзіраў рот, 44 камандзіры і камісары партызанскіх атрадаў, 4 камандзіры партызанскіх брыгад.

Пры вызваленні акупіраванай тэрыторыі актывізаваўся рух моладзі па добраахвотнаму ўступленню ў дзеючую армію, які найбольш шырока распаўсюдзіўся ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі. У час ажыццяўлення войскамі Чырвонай Арміі Гомельска-Рэчыцкай аперацыі толькі ў падраздзяленні 65-й арміі

Камсамольскія камітэты актывізавалі гэту работу ў вызваленых ад акупантаў раёнах. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці да лістапада 1944 г. было адрамантавана 197 школ, 5 дзіцячых дамоў, дзіцячы прыёмнік у Клічаве. Пра высакароднасць беларускіх юнакоў і дзяўчат сведчыць факт, што яны ў свае сем'і ўзялі на выхаванне 374 сіраты. Для школ быў арганізаваны збор вучэбных дапаможнікаў. Толькі ў Дрыбінскім раёне было сабрана больш за 500 школьных падручнікаў [23, с. 397—398].

Адзначым, што клопат моладзі пра дзяцей — гэта не выпадковая акцыя, а мэтанакіраваная дзейнасць, якая падтрымлівалася дзяржаўнымі, партыйнымі структурамі, асабліва з боку камсамольскіх камітэтаў.

Ва ўмовах вызвалення Беларусі палітыка аргэсара ў адносінах да моладзі пацярпела крах. Заснаваныя прагерманскія саюзы моладзі згортвалі сваю дзейнасць, а іх лідэры разам з войскамі ворага эвакуіраваліся на тэрыторыю Германіі. Акупанты не змаглі ў поўнай меры рэалізаваць планы па вывазу на працу ў рэйх беларускіх дзяцей, падлеткаў і моладзі.

Пад уплывам арганізацыйна-прапагандысцкай работы, асабліва на фоне масавага выгнання германскіх захопнікаў, падрастаючае пакаленне ў большасці станоўча ўспрымала камуністычныя ідэалы, падзяляла іх, ставілася як да нормы ў паўсядзённым жыцці, грамадскай працы і вытворчасці.

## *ЛІТАРАТУРА, КРЫНІЦЫ*

1. Великая Отечественная война 1941—1945 гг.: Энцыклапедыя. М., 1985.

2. *Каваленя А. А., Калеснікава А. М.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941—1944 гг. // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: Зб. навук. арт. Мн., 1998. С. 77—90; Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941—1945 гг.: Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 481.

3. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941—1945 гг. С. 285—286.

4. Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне: Документы и материалы. Мн., 1988. С. 17; Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1944): Краткие сведения об организации, структуре и составе. Мн., 1976. С. 12; *Каваленя А. А.* Арганізацыйная структура камсамольска-маладзёжнага падполля на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (1941—1942 гг.) //Беларусь у гады

другой сусветнай вайны: урокі гісторыі і сучасна
Мн., 1995. С. 201—208.

5. НАРБ. Ф. 3500. Воп. 12. Спр. 10. Л. 1—10.

6. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в го
Великой Отечественной войны. Мн., 1973. Т. 2. Кн. 1.

7. *Пахомов Я., Дорофеенко Я.* Витебское подпо
Мн., 1969. С. 219.

8. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-ф
шистских захватчиков. Мн., 1985. Т. 3.

9. *Каваленя А. А.* Да пытання заснавання прагерманс
маладзёжных саюзаў //Пытанні гісторыі, метадалогіі і метод
кі выкладання: Зб. навук. арт. Мн., 1998. Вып. 1.

10. НАРБ. Ф. 3576. Воп. 1. Спр. 3. Л. 4—11.

11. *Аблова Р.* Это было в Белоруссии. М., 1957.

12. НАРБ. Ф. 3726. Воп. 1. Спр. 3. Л. 31—32, 4—1
Ф. 63. Воп. 5. Спр. 41. Л. 17—18; *Аблова Р.* Это было в Бе
руссии. С. 97—100.

13. Нацистская политика геноцида «выжженной земл
в Белорусии (1941—1944). Мн., 1984. С. 46.

14. Белорусские остарбайтеры: Угон населения Белорус
на принудительные работы в Германию (1941—1944): Докуме
ты и материалы: В 2 кн. Мн., 1996. Кн. 1: (1941—1942 гг.)
С. 24—25.

15. НАРБ. Ф. 63. Воп. 5. Спр. 78. Л. 3.

16. *Каваленя А. А.* Падрыхтоўка партызанскай моладзі да
ўзброенай барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі //Ста-
ронкі ваеннай гісторыі Беларусі. Мн., 1998. Вып. 2. С. 156—170.

17. НАРБ. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 633. Л. 20.

18. НАРБ. Ф. 63. Воп. 5. Спр. 77. Л. 31—36.

19. *Сямашка Я. І.* Армія Краёва на Беларусі. Мн., 1994.

20. НАРБ. Ф. 4. Воп. 61. Спр. 53. Л. 18.

21. НАРБ. Ф. 63. Воп. 5. Спр. 31. Л. 22—24; Очерки исто-
рии Ленинского комсомола Белоруссии. Мн., 1975. С. 316—317.

22. НАРБ. Ф. 3572. Воп. 1. Спр. 17. Л. 3.

23. Комсомол Белоруссии в Великой Отечественной войне.
С. 435.

## *SUMMARY*

*The military political situation on the territory of Belarus during the period of its liberation from Nazi invaders, the rise and development of patriotic youth movement are described in the article. The author attempts to appreciate the moral-psychological problems that lead to ideological separation and even to armed opposition among young people.*